**Л.А.Дзямешка,**
**прафесар Беларускага універсітэта культуры**

# ВЫТВОРЧАЯ ПРАКТЫКА НА ФАКУЛЬТЭЦЕ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНЫХ СІСТЭМ: СТАН, ПРАБЛЕМЫ, ШЛЯХІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

Вопыт работы на факультэце па правядзенні вытворчай практыкі студэнтаў дае падставу вылучыць некалькі станоўча вырашаных пытанняў.

Арганізацыйныя пытанні. Базы вытворчай практыкі адпавядаюць патрабаванням да яе, паколькі штогод сумесна з вучэбным аддзелам пераглядаюцца і ўдакладняюцца.

Праграмы практыкі распрацоўваюцца вядучымі выкладчыкамі, абмяркоўваюцца на кафедрах, на савеце па вытворчай практыцы і на савеце ФБІС. Затым яны ўзгадняюцца з базавымі ўстановамі. Парады, выказаныя вопытнымі спецыялістамі, улічваюцца і спрыяюць удасканаленню праграм.

Інструктаж студэнтаў арганізуецца дэканатам, праводзіцца саветам па практыцы сумесна з вучэбным аддзелам, дэканатам і выкладчыкамі факультэта, якія арыентуюць студэнтаў у праходжанні практыкі, яе змесце, методыцы, накіроўваюць на якаснае выкананне вучэбных заданняў, навукова-даследчай і практычнай работы, на выяўленне камунікатыўных рыс у прафесійных калектывах, на дысцыплінаванасць і адказнасць.

Выкладчыкі наведваюць базы практыкі з мэтай кантролю. Вынікі практыкі абмяркоўваюцца на пашыраных нарадах у бібліятэках з удзелам кіраўнікоў, вядучых спецыялістаў, студэнтаў. Пажаданні, меркаванні, заўвагі спецыялістаў і студэнтаў адлюстроўваюцца ў пратаколах па абароне практыкі, якія дадаюцца да брыгадных справаздач.

На падставе брыгадных справаздач і прапаноў кіраўнікоў рыхтуецца агульная справаздача, якая абмяркоўваецца на кафедрах, зацвярджаецца на савеце факультэта. Пры абмеркаванні выпрацоўваюцца рэкамендацыі, прымаюцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адпаведныя рашэнні. Працэс абмеркавання садзейнічае ўдасканаленню арганізацыі і зместу практыкі. Зацверджаная саветам справаздача падаецца ў вучэбны аддзел. Замацаваны вопыт арганізацыйнай работы дазваляе сістэматычна аналізаваць недахопы, узніклыя на глебе змен вучэбных планаў, выпрацоўваць слушныя прапановы і ўкараняць іх.

Метадычнае забеспячэнне. Распрацавана і зацверджана саветам ФБІС "Палажэнне аб вытворчай практыцы студэнтаў факультэта ФБІС", у якім вызначаны мэта, задачы, змест, арганізацыя, кіраўніцтва практыкай, абавязкі студэнтаў, кіраўнікоў, парадак падвядзення вынікаў.

Для практыкантаў (а гэта студэнты IV і V курсаў) падрыхтаваны праграмы практыкі, у якія пры неабходнасці ўносяцца змены. Студэнты IV курса праходзяць вытворчую практыку па адзінай праграме, а праграмы для практыкантаў V курса распрацаваны строга дыферэнцыравана з улікам кожнай спецыялізацыі. Такім чынам, метадычнае забеспячэнне вытворчай практыкі студэнтаў вырашаецца станоўча.

Змястоўны аспект. Бібліятэчная практыка студэнтаў — галоўная частка падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Гэта ступень прымянення тэарэтычных ведаў ва ўмовах бібліятэчнай дзейнасці, першае назапашанне прафесійнага вопыту, першае асэнсаванне студэнтам сябе як суб'екта вытворчай дзейнасці калектыву. Праграмы практыкі прадугледжваюць паступовы творчы працэс самаідэнтыфікацыі студэнта з пэўнымі вытворчымі працэсамі, вызначэнне будучым спецыялістам свайго месца, сваёй індывідуальнасці, сваёй тэхналогіі ў межах вызначанай спецыялізацыі.

У тэарэтычным аспекце намі распрацавана мадэль бібліятэчнай практыкі ў кантэксце асноўных палажэнняў дзяржаўнага стандарта вышэйшай адукацыі. Мадэль мяркуе яе бесперапыннасць і ўключае тры этапы: першапачатковае асэнсаванне студэнтам сваёй суб'ектнасці ў бібліятэчным асяроддзі (першы этап); самавызначэнне студэнтам найбольш прыярытэтных для сябе накірункаў бібліятэчнай дзейнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў суадносінах з асобаснымі ўстаноўкамі і якасцямі (другі этап); мадэліраванне будучым бібліятэкарам прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з абранай спецыялізацыяй (трэці этап).

Для ўдасканалення змястоўнага аспекту практыкі, на наш погляд, неабходна перанесці яе пачатак на III курс (пасля азнаямляльнай вучэбнай практыкі на II курсе). Праграмы яе патрэбна распрацаваць па тых спецыяльных дысцыплінах, якія студэнты вывучаюць на II і палове III курса, а менавіта, па фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў. На IV курсе лагічна распрацаваць праграмы па ўсіх відах абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, а на V курсе — па спецыялізацыях. Тут жа будзе і непасрэдны пераход да пераддыпломнай практыкі. У такім выглядзе практыка набывае лагічны аспект. Знікае перапынак паміж вучэбнай азнаямляльнай практыкай (II курс) і вытворчай (IV курс). А гэта дазволіць паступова і метадычна развіваць прафесійныя якасці і арганізацыйныя здольнасці студэнтаў, скараціць перыяд адаптацыі маладога спецыяліста пасля размеркавання на працу, да таго ж, упарадкаваць расклад па нагрузцы выкладчыкаў. У змест практыкі на III курсе, магчыма, ёсць сэнс уключыць спецыфічную дзейнасць практыкантаў па развіцці прафесійна-асобасных уласцівасцей і якасцей.

Пажадана таксама пашырыць кантынгент баз практыкі за кошт розных рэгіёнаў краіны, вярнуць былы вопыт выязной практыкі. Неабходна вырашыць пытанне аб сумяшчальнасці тэм дыпломных праектаў са спецыфікай дзейнасці базавых установаў, што будзе спрыяць удасканаленню пераддыпломнай практыкі.

Ёсць прапанова ў праграмах практыкі адлюстраваць прафарыентацыйную работу студэнтаў сярод моладзі і выпускнікоў сярэдніх школ, распрацаваць заданні, асабліва па спецыялізацыях "публічныя бібліятэкі", "дзіцячыя бібліятэкі".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ